# СОРАК ГОД НА МАРШЫ

**Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР у красавіку 1945 года Е. У. Дабравольскаму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.**

**Нарадзіўся ў 1903 годзе ў вёсцы Шалаёўка нашага раёна. Жыў у вёсцы, разам з бацькам займаўся сельскай гаспадаркай. Тут уступіў у камсамол, змагаўся з мясцовымі багацеямі.**

**У 1924 годзе прызван у рады Савецкай Арміі, прысвяціў вайсковай службе ўсё сваё жыццё.**

Вайна з'явілася нечаканай навалай. На берагах Буга і Бярэзіны, Сожа і Дняпра грымелі бітвы, чорнай зграяй рухалася гітлераўская армія, бяда кацілася з захаду, а Ерафей Уладзіміравіч Дабравольскі, байцы яго 237 мотастралковага палка яшчэ былі павернуты тварам на ўсход. Яны абаранялі савецкую граніцу ад самураяў.

Гэта быў цяжкі час. Яму, беларусу, не верылася, не ўяўлялася, што здарылася бяда, што горад за горадам, вёску за вёскай акупіруе і рабуе каварны вораг. Узяты Мінск і Бабруйск, Полацк і Орша. Смерць і пажары над роднай Беларуссю, над яго маленькай, у сорак сялянскіх двароў, Шалаёўкай.

Загад аб перадыслакацыі на захад 69 стралковай дывізіі, у якую ўваходзіў і яго мотастралковы полк, Дабравольскі ўспрыняў як найвялікшае шчасце. Ен прагнуў сустрэчы з ворагам. Час ад часу даставаў з планшэта карту і пад перастук вагонных колаў вырашаў цяжкую задачу. Прагна ўслухоўваючыея ў апошнія паведамленні Саўінфармбюро, хацеў пачуць штосьці ўцешнае, абнадзейваючае. Але ўцехі не было. Нервова сціскаліся зубы, скрыпеў на іх дарожны пыл. Дабравольскі ўглядаўся ў вочы сваіх байцоў. Яму здавалася, што ў першай жа сустрэчы з ворагам 237 мотастралковы дакажа, што значыць байцы-чырвонаармейцы.

Сустрэча адбылася нечакана і зусім не так, як яе ўяўляў палкоўнік Ерафей Дабравольскі. Пад націскам гудэрыянаўскіх страшыдлаў адступіла 92 стралковая дывізія, здала ворагу смаленскі гарадок Батурына. Разам з ёй адкатваліся на ўсход і батальёны 237 мотастралковага палка з раненым камандзірам на чале.

Гэтага бою Ерафею Уладзіміравічу не забыць ніколі. Было сорамна за сябе, за сваіх байцоў. Не ўзнімаючы вачэй, яны ішлі міма жанчын, якія, скрыжаваўшы рукі на грудзях, нема пыталіся: "Куды ж вы, саколікі нашы?..".

Войскі адступалі. Пануры і злы, не мяняючы засохшай павязкі на ране, адступаў і Дабравольскі. За доўгія месяцы не аднойчы зведаў цану жыцця і смерці. Затое пазней ён паўтараў салдатам: "Перамогі дастаюцца адважным і смелым, ордэны даюць за громкія баявыя

справы, але тройчы герой той, хто перамагае адступаючы. Не забывайце фельдмаршала Кутузава і яго вопыт".

У сярэдзіне 1943 года генерал-маёр Дабравольскі камандуе 134 стралковай дывізіяй, мерае дарогі Смаленшчыны ўжо з усходу на захад. У тое лета за ўмелае кіраўніцтва баявымі дзеяннямі пры прарыве моцна ўмацаванай абароны ворага ў раёне горада Духаўшчына яго прадстаўляюць да ўзнагароды ордэнам Суворава ІІ ступені.

Хутка пасля бітвы пад Духаўшчынай Вярхоўнае Галоўнакамандаванне назначае Ерафея Уладзіміравіча камандзірам 84 стралковага корпуса. Ламаючы ўпартае супраціўленне немцаў, у канцы снежня 1943 года корпус генерала Дабравольскага вызваляе першыя беларускія вёскі і выходзіць на подступы да Віцебска.

Уперадзе ляжала родная беларуская зямля, прагнучая свабоды, але абставіны патрабавалі іншага: трэба было падцягнуць тылы, накапіць і сканцэнтраваць сілы для новых пераматаносных бітваў. А для гэтага спатрэбіўся не адзін дзень і нават не адзін месяц. Накапленне сіл ішло да пачатку лета 1944 года.

Ерафей Уладзіміравіч часта шкадуе, што асабіста яму не давялося ўдзельнічаць у вызваленні той зямлі, дзе нарадзіўся, дзе прайшло яго басаногае юнацтва. Літаральна за месяц да пачатку бітваў за вызваленне Беларусі яго камандзіруюць на Крымскі паўвостраў прымаць 16-ы стралковы корпус, які павінен быў перадыслакавацца ў састаў 1-га Беларускага фронту. З пачатку лета 1944 года падзеі развіваюцца з такой імклівасцю, што корпус Дабравольскага прыбывае толькі на заходнюю граніцу ўжо вызваленай Беларусі.

Адсюль, разам з іншымі падраздзяленнямі Савецкай Арміі, 16-ы стралковы корпус пачынае свой пераможны марш да Берліна. На шляху яму выпадае не адна жорсткая схватка з ворагам, але асабліва памятнымі засталіся баі каля польскага гарадка Казімеж і ля нямецкага горада Цербет, на захад ад Берліна.

У выніку першай аперацыі, прарваўшы казімежскую абарону ворага і неадступна праследуючы яго да ракі Одэр, корпус Дабравольскага знішчыў звыш 7000 нямецкіх салдат і афіцэраў, больш 1200 узяў у палон, вывеў са строю 550 варожых гармат, 123 танкі, звыш 4000 аўтамашын і шмат іншай баявой тэхнікі.

Цяжкімі, упартымі былі баі і ля горада Цербета. Гітлераўскія галаварэзы на подступах да цэнтра фашысцкай Германіі аказвалі жорсткае супраціўленне. Але баявому духу савецкіх салдат, іх імкненню да перамогі ўжо нішто не магло супрацьстаяць.

Ерафею Уладзіміравічу Дабравольскаму ў красавіку 1945 года было прысвоена воінскае званне генерал-лейтэнант і тады ж ён быў удастоен высокага звання Героя Савецкага Саюза. Залатая Зорка на яго грудзях – гэта высокая ацэнка многіх баявых подзвігаў камуніста, чалавека, які ўсёй душой любіць сваю Радзіму, адстойваў яе свабоду, не шкадуючы свайго жыцця.

...У 1964 годзе Е. У. Дабравольскі ўходзіць іу запас. Сорак год на баявым маршы прабыў сялянскі сын з глухой беларускай вёскі з жартаўлівай назвай Шалаёўка. Ад салдата да генерал-лейтэнанта. Ад радавога да намесніка камандуючага ваеннай акругі.

Што і гаварыць: шлях слаўны! Жыццё, дастойнае пераймання.

**Сорак год на маршы // Магілёўская праўда. — 1970. — 14 сакавіка. — С. 4.**